# ЭТНАГРАФІЧНЫЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ КАФЕДРЫ ЭТНАЛОГІІ, МУЗЕЯЛОГІІ І ГІСТОРЫІ МАСТАЦТВАЎ БДУ (2001–2021)

***Т. А. Навагродскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* tadeush_minsk@mail. ru

У артыкуле падрбязна паказана гісторыя палявых этнаграфічных даследаванняў, якія праводзіць кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Апісаны рэгіёны, дзе працавалі этнаграфічныя экспедыцыі кафедры, падкрэсліваецца важнасць авалодання навыкамі палявой работы у працэсе падрыхтоўкі студэнтаў. На прыкладзе вывучэння традыцый харчавання звернута ўвага на асноўныя віды работы ў этнаграфічнай экспедыцыі, паказаны спосабы фіксацыі звестак па народным харчаванні. Нягледзячы на змены і эвалюцыю многіх элементаў культуры, падкрэсліваецца важнасць палявых этнаграфічных матэрыялаў як спецыфічнай крыніцы этналагічнай навукі.

***Ключавыя словы:*** этнаграфічныя экспедыцыі; палявыя даследаванні; кафедра; традыцыйная культура.

# ЭТНОГРАФИЧЕСКИЕ ЭКСПЕДИЦИИ КАФЕДРЫ ЭТНОЛОГИИ, МУЗЕОЛОГИИ И ИСТОРИИ ИСКУССТВ БГУ (2001–2021)

***Т. А. Новогродский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,* tadeush_minsk@mail. ru

В статье подробно показана история полевых этнографических исследований, которые проводит кафедра этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета. Описаны регионы, где работали этнографические экспедиции кафедры, подчеркивается важность овладения навыками полевой работы в процессе подготовки студентов. На примере изучения традиций питания обращено внимание на основные виды работы в этнографической экспедиции, показаны способы фиксации сведений по народному питанию. Несмотря на смены и эволюцию многих элементов культуры, подчеркивается важность полевых этнографических материалов как специфического источника этнологической науки.

***Ключевые слова:*** этнографические экспедиции; полевые исследования; кафедра; традиционная культура.

# ETHNOGRAPHIC EXPEDITIONS OF THE DEPARTMENT OF ETHNOLOGY, MUSEOLOGY AND HISTORY OF ARTS OF BSU (2001–2021)

***T. A. Navagrodski***

*Belarusian State University, Independence Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, Minsktadeush_minsk@mail. ru*

The article details the history of field ethnographic research conducted by the Department of Ethnology, Museology and Art History of the Faculty of History of the Belarusian State University. The regions where the ethnographic expeditions of the department worked are described, the importance of mastering the skills of field work in the process of preparing students is emphasized. On the example of studying the traditions of food, attention is paid to the main types of work in the ethnographic expedition, shows ways to record information on food. Despite the changes and evolution of many elements of culture, the importance of field ethnographic materials as a specific source of ethnological science is emphasized.

***Key words:*** ethnographic expeditions; field research; department; traditional culture.

Выкладчыкі кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў з самага пачатку яе стварэння штогод разам са студэнтамі праводзяць палявыя этнаграфічныя даследаванні ва ўсіх гістарычна-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі. Для студэнтаў чытаецца спецыяльны курс «Методыка палявых этнаграфічных даследаванняў», дзе яны знаёмяцца з методыкай і практыкай работы ў полі па вывучэнню матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры беларусаў, этнічных груп Беларусі. Праграма дысцыпліны спецыялізацыі прадугледжвае вывучэнне гісторыі палявых даследаванняў, падрыхтоўку экспедыцыі, арганізацыю палявых этнаграфічных даследаванняў, вядзенне палявой дакументацыі. Шмат увагі надаецца падрыхтоўцы і састаўленню апытальнікаў па самых розных праблемах беларускай этналогіі.

Матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў або экспедыцыйныя матэрыялы састаўляюць спецыфіку этналагічных даследаванняў. Выкарыстанне ў навуковых этналагічных працах палявых матэрыялаў, сабраных самім даследчыкам, значна павышае навуковую значнасць такіх работ. Асаблівасць крыніцы, атрыманай ў ходзе экспедыцыі, заключаецца ў тым, што яна стварaецца самім даследчыкам у час палявой работы. Таму пры падрыхтоўцы этнолагаў авалоданню навыкамі палявых даследаванняў ўдзяляецца вялікая ўвага.

У этнаграфічных экспедыцыях яе ўдзельнікі (студэнты, магістранты, аспіранты і выкладчыкі) ажыццяўляюць асноўныя віды работ: асабістае назіранне і фіксацыя яго вынікаў; гутарка з мясцовымі жыхарамі; збор этнаграфічных прадметаў і калекцый; фотаздымка, кіназдымка, відэаздымка.

Палявыя этнарафічныя даследаванні на гістарычным факультэце пачалі праводзіцца з ліпеня 1998 г. разам з археолагамі на Браслаўшчыне. Была створана група, якая займалася зборам этнаграфічных матэрыялаў. Вывучаліся такія тэмы, як традыцыі харчавання, радзінныя звычаі і абрады беларусаў, народная педагогіка, традыцыйныя веды і інш. Былі

абследаваны вёскі Зазоны, Вярбоўка, Зарачча, Урбаны, Жвірыні, Ельня, Краснаполле, Бужаны, Усяны, Луні, Мар'янполе, Зыбкі, Запруддзе, Жвірблі, Заблудзішкі, Слабодка, хутары Асінаўка і Коханішкі. У этнаграфічнай экспедыцыі студэнты і выкладчыкі ажыццяўляюць асноўныя віды работ: асабістае назіранне і фіксацыя яго вынікаў; гутарка з мясцовымі жыхарамі; збор этнаграфічных прадметаў і калекцый; фотаздымка, кіназдымка, відэаздымка. Вынікі даследавання былі выкдадзены на навукова-практычнай канферэнцыі ў горадзе Браслаў і надрукаваны ў «Браслаўскім сшытку» [1].

У ліпені 2000 г. палявыя даследаванні праводзіліся ў вёсцы Літоўшчына Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці і вёсках Вязынка, Радашковічы, Крывое Сяло, Кукшавічы, Шчокі, Петрышкі, Петкавічы, Шацілы, Пятроўка, на станцыях Зялёнае, Яцэвічы, Камсамолец Мінскага раёна Мінскай вобласці.

Пасля стварэння ў чэрвені 2001 г. кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў пачаліся праводзіцца самастойныя палявыя этнаграфічныя даследаванні. На працягу 24 год кіраўніком этнаграфічных экспедыцый БДУ з'яўляецца прафесар Т. А. Навагродскі. У этнаграфічных экспедыцыях працавалі дацэнты І. С. Махоўская (2001–2007, 2018, 2021), С. А. Захаркевіч (2008–2017, 2020), І. У. Алюніна (2009–2015, 2019, 2021), І. Г. Бачыла (2016–2021), М. А. Міхайлец (2019–2020). У палявых даследаваннях прымаюць удзел студэнты, магістранты і аспіранты кафедры. Яшчэ будучы студэнткай, Вольга Барташ актыўна праводзіла палявыя даследаванні сярод цыганоў Беларусі. Затым яна абараніла кандыдацкую дысертацыю і зараз выкладае цыганалогію ва ўніверсітэтах Еўропы. Юрый Унуковіч таксама ў студэнцкія гады пачаў збіраць палявыя матэрыялы па літоўскай этнічнай групе, вывучыў літоўскую мову і паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю па гэтай праблеме. Канстанцін Шумскі для грунтоўнага вывучэння народных ведаў выкарыстаў шматлікія палявыя матэрыялы, якія ён пачаў сабіраць яшчэ ў студэнцкія гады ў этнаграфічных экспедыцыях кафедры. Алеся Якубінская, будучы аспіранткай кафедры, таксама прымала актыўны ўдзел у этнаграфічных экспедыцыях і па ўласна распрацаваным апытальніку сабрала ўнікальны этнаграфічны матэрыял па традыцыйным спосабах і сродках сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян, які яна ўвяла ў навуковы ўжытак у дысертацыі і надрукавала ў сваёй манаграфіі.

У 2001–2003, 2005 і 2008 гг. палявыя даследаванні па традыцыях харчавання і вуснай гісторыі мясцовых жыхароў праводзіліся ў гарадскім

пасёлку Мір Карэлічскага раёна Гродзенскай вобласці, а таксама ў вёсках Вялікае Сяло, Прылукі, Засценак, Міранка, Аюцавічы, Сімакава, Возерскае гэтага ж раёна. Вынікам палявой работы на працягу двух сезонаў у г. п. Мір стала манаграфія «Мір: гісторыя мястэчка, што расказалі яго жыхары» – гісторыя населенага пункта, прадстаўленая праз погляд яго жыхароў [2].

Даследаванні ў гарадскім пасёлку Ружаны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, вёсках Байкі, Маньчыкі, Малочкі, Паўлава, Заполле, Воля гэтага ж раёна былі праведзены ў ліпені 2004 г. У ліпені 2006 г. этнаграфічныя матэрыялы па зменах у традыцыях харчавання сабраны ў вёсках Гольчыцы, Кулікі, Барок, Ржэўка, Макаўшына, Вынішчы, Кальчыцы, Копань, пасёлку Нява Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Вёскі Дзмітравічы, Каменюкі, Вялікалессе, Чарнакі, Чвіркі, Падомша, Хамуціны, Панасюкі, Падбела, Пашукі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці вывучаліся ў ліпені 2007 г.

Збор палявога матэрыялу па традыцыях харчавання ў ліпені 2009 г. ажыццяўляўся ў вёсцы Моталь, а ў ліпені 2010 г. у вёсцы Тышкаўцы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Тэрыторыя беларуска-літоўскага памежжа даследавалася ў ліпені 2011 г.: матэрыял запісаны ў вёсках Віктасіна, Гальчуны, Гелюны, Гервяты, Гіры, Гудзянікі, Рымдзюны, Пелігрында, Петрыкі, на хутары Керплашына Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. У ліпені 2012 г. матэрыял збіраўся ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці, а ў ліпені 2013 г. даследаванні праводзіліся ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці. Вёскі Стары Лепель і Юркаўшчына Лепельскага раёна гэтай жа вобласці сталі аб’ектам вывучэння падчас працы ў экспедыцыі ў ліпені 2014 г. У кожнай з гэтых экспедыцыях на працягу трох тыдняў было апытана звыш 60 інфармантаў, зроблены фотаздымкі. Матэрыялы былі надрукаваны ў некалькіх этнаграфічных зборніках [3].

Палявыя этнаграфічныя матэрыялы па народнай культуры жыхароў вёсак Слабодка, Завер’е, Вусце, Гаўрылава, Луні, Кірылава Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці збіраліся ў ліпені 2015 г. Яны апрацаваны і падрыхтаваны да друку. У ліпені 2016 г. матэрыялы па народнай культуры збіраліся ў вёсцы Мсціж і навакольных вёсках Мроі, Гараджанка, Старое Сяло Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Экспедыцыя 2017 г. на Лунінеччыну была прысвечана стогадоваму юбілею вывучэння вічынскіх палян І. А. Сербавым. Матэрыялы па зменах і трансфармацыі традыцыйнай культуры мясцовых жыхароў збіраліся ў вёсках Вічын,

Дварэц, Дрэбск, Яжаўкі, Язвінкі, Кажан-гарадок Лунінецкага раёна Брэскай вобласці. Падчас экспедыцыі было зроблена некалькі соцен фотаздымкаў і набыта звыш 50 этнаграфічных прадметаў. Сабраны і апрацаваны матэрыял агульным аб'ёмам 342 старонкі падрыхтаваны да друку.

Палявы сезон улетку 2018 г. адбываўся на Лідчыне, дзе ажыццяўляўся збор этнаграфічнага матэрыялу па культурных традыцыях Лідчыны ў вёсках Ваверка, Кавалі, Красноўцы, Серафіны, Паперня, Альхоўка, Чаплі. Сабраныя матэрыялы апрацаваныя і падрыхтаваныя да выдання. З 10 па 30 ліпеня 2019 г. была арганізавана этнаграфічная экспедыцыя ў Зельвенскі раён Гродненскай воблаці Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ прафесара Навагродскага Т. А., дацэнтаў Алюнінай І. У. і Бачыла І. Г. На працягу трох тыдняў па спецыяльна падрыхтаваных апытальніках студэнтамі і выкладчыкамі праводзіўся збор палявога этнаграфічнага матэрыялу па асаблівасцях традыцыйнай культуры мясцовых жыхароў. Было апытана звыш 80 жыхароў Зельвы, Дзярэчына, Міжэрыч, а таксам навакольных вёсак – Сынкавічы, Дзергілі, Шэйкі, Клепачы, Задвор'е, Тулава і інш. Па выніках апытання падрыхтаваны электронны варыянт зборніка матэрыялаў «Культурныя традыцыі Зельвеншчыны».

У сувязі з эпідэміяй каронавірусу палявыя даследаванні летам 2020 г. і летам 2021 г. праводзіліся дыстанцыйна. Студэнты па распрацаванаму апытальніку збіралі матэрыялы па месцы жыхарства і дасылалі іх кіраўнікам, якія з выкарыстаннем інфарматыўна-камунікатыўных сродкаў аператыўна вычытвалі, папраўлялі, рабілі заўвагі. Па выніках сезону ў анлайн-рэжыме быў праведзены навукова-метадычны семінар, дзе кожны з удзельнікаў зрабіў справаздачу і адказаў на пытанні калег і выкладчыкаў. Такі вымушаны від работы дазволіў ахапіць амаль усю тэрыторыю Беларусі і атрымаць цікавыя вынікі.

На працягу многіх год аўтар, прымяняючы стацыянарны метад даследавання, вывучаў традыцыі харчавання ў роднай вёсцы Арцюшы Шчучынскага раёна Гродзенскай вбласці. Шляхам уключанага назірання ўдалося сабраць найбольш поўныя звесткі аб розных аспектах культуры харчавання ў гэтай мясцовасці: запісаць тэхналогію прыгатавання страў, апісаць трапезы, народны этыкет, прадметы хатняга начыння, якія выкарыстоўваліся для прыгатавання, захоўвання і ўжывання ежы, адзначыць сучасныя змены ў традыцыях [4, с. 196–199 ].

Пры правядзенні палявых этнаграфічных даследаванняў аўтар імкнуўся найбольш поўна і падрабязна запісаць рэцэптуру мясцовых страў і тэхналогію іх прыгатавання, якая часта вельмі складаная і ад прытрымлівання якой залежыць якасць ежы. У тэхналогіі важна выявіць не толькі спосабы механічнай ці хімічнай апрацоўкі (рэзанне, здрабненне, квашэнне, вымочванне і г. д.), але і парадак, паслядоўнасць працэсаў, іх працягласць. Асаблівая ўвага звярталася на такія аспекты традыцыйнай культуры харчавання, як прадметы хатняга начыння, посуд, у якім гатуюць ежу, рэжым падагрэву, асаблівасці захоўвання гатовых страў і г. д.

Шмат увагі пры вывучэнні гэтай праблемы звярталася на фіксацыю мясцовай кулінарнай тэрміналогіі. Часта не толькі ў розных рэгіёнах, але нават у суседніх вёсках адна і тая ж страва можа мець розныя назвы. Напрыклад, абабраная бульба, звараная ў пасоленай вадзе, на Гродзеншчыне вядома пад назвамі «салёная», «вараная»; на Магілёўшчыне – «параная»; у заходняй частцы Палесся – «салонцы»; ва ўсходняй – «салонікі», «салонка», «паронкі» [5, л. 22, 41, 68, 77, 89]. Распаўсюджаная на тэрыторыі Беларусі страва «саладуха» зафіксавана намі таксама пад назвамі «путра» і «раўгеня», а агульнавядомая «зацірка» сустракаецца пад назвамі «лямешка», «заціруха», «саламаха».

Многія кулінарныя вырабы (цэпяліны, круглыя бліны, каравай, «жаваранкі», «сарокі» і інш.) маюць дакладна ўстаноўленую форму. Для яе фіксацыі прыходзілася звяртацца да фатаграфавання. Фіксаваліся таксама спосабы ўпрыгожвання ежы (напрыклад, расфарбоўка яек, упрыгожванне вясельнага каравая).

Разам з палявымі даследаваннямі, навуковыя кіраўнікі ў экспедыцыі пастаянна арганізоўваюць для студэнтаў экскурсіі па горадзе ці мястэчку, наведваюць мясцовыя краязнаўчыя музеі, ходзяць і на аграсядзібы, праходзяць па зялёных маршрутах, праводзяць прафарыентацыйную работы сярод школьнікаў. Частку набытых этнаграфічных прадметаў мы пакідалі ў раённых краязнаўчых або школьных музеях. Часта студэнты дапамагалі інфармантам па гаспадарцы, ладзілі рамонт будынкаў і проста наладжвалі сяброўскія адносіны. Пасля работы ў этнаграфічнай экспедыцыі многія студэнты пачыналі пісаць курсавыя, дыпломныя, магістарскія і кандыдацкія дысертацыі менавіта па этналогіі. А любоў да этналогіі заставалася ў іх на ўсё жыццё.

Такім чынам, правядзенне палявых этнаграфічных даследаванняў застаецца актуальным і ў наш час. Важна паспець занатаваць ад пажылых

людзей карысную для навукі інфармацыю, бо з кожным годам носьбітаў гэтай іінфармацыі становіцца ўсё меньш. Неабходна звярнуць увагу на змены ў многіх элементах культуры, іх эвалюцыю і трансфармацыю. Этнолагі, якія працуюць на кафедры, не толькі рыхтуюць спецыялістаў, якія грунтоўна валодаюць навыкамі палявой работы, але і самі прымаюць актыўны ўдзел у зборы матэрыялаў у этнаграфічных экспедыцыях ва ўсіх гістарычна-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, а таксама за яе межамі: у Балгарыі, Польшчы, Расіі, Украіне і інш.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Навагродскі Т. А. Народная кулінарыя Браслаўшчыны (на матэрыялах палявых этнаграфічных даследванняў) // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навук.-краязн. канф., прысвеч. 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьм. крыніцах, Браслаў, 27–28 крас. 2001 г. / Брасл. музейн. аб'яд-не, Брасл. краязн. т-ва ; рэд. рада: К. Шыдлоўскі [і інш.]. Браслаў, 2001. С. 68–70.
2. Раманава І., Махоўская І. Мір: гісторыя мястэчка, што расказалі яго жыхары. Вільня: ЕГУ, 2009. 248 с.
3. Навагродскі Т. А., Алюніна І. У., Захаркевіч С. А. Народная кухня маталян. Мінск: [б. в.], 2009. 99 с.; Навагродскі Т. А., Алюніна І. У., Захаркевіч С. А. Народная кухня тышкаўцоў. Мінск: [б. в.], 2010. 195 с.; Навагродскі Т. А. Кулінарная спадчына Белавежжа = Kulinarne dziedzictwo Białowieży / аўт. тэкста Т. А. Навагродскі; пер. А. У. Ветрава. Мінск: [б. в.], 2010. 51 с.; Навагродскі Т. А., Алюніна І. У. Народная кухня Гервятаў. Мінск: Послед. слово, 2011. 172 с.; Навагродскі Т. А., Алюніна І. У., Захаркевіч С. А. Народная кухня Семежава. Мінск: Вішнёўка, 2013. 248 с.; Навагродскі Т. А., Алюніна І. У., Захаркевіч С. А. Народная кухня Лепельшчыны. Мінск: Колорград, 2017. 528 с.
4. Навагродскі Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях. Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2015. 243 с.
5. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 6. Воп. 13. Спр. 67.